# Мая Радзіма – Беларусь

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Гімназія № 37 г. Мінска”
Чупрыс Мар’ян, вучань 5 “Б” класа

Беларусь…Наша маленькая, але такая вялікая Радзіма! Неверагодна, колькі сінонімаў можна падабраць да гэтага слова! А яшчэ больш асацыяцый. Дзеці, бацькі, родныя, сябры, дом, праца, мова. Нашы сапраўдныя каштоўнасці: дабрабыт, гасціннасць, мір, бусел, сонца, прырода, справядлівасць, перамога, памяць, бяспека.

Якая прыгожая назва ў нашай краіны – Беларусь! Далікатнае і паэтычнае імя як нельга лепей падыходзіць ёй. Беларусі не ўласцівы яркія фарбы, не здзівіць яна і экзатычнасцю Афрыкі або тонкай хітрасцю Усходу. Яе ціхае хараство выяўляецца ў блакіце неба, у зеляніне палёў, у казачным водары хваёвага бору, у сумным крыку жураўлёў, у клёкаце буслоў.

Прыгажосць нашай краіны адкрыецца таму, хто здольны спыніцца і адчуць навакольны свет, зазірнуць у глыбокія вочы Беларусі – сінія азёры, апусціць рукі ў бадзёрую ваду крыніцы, пахадзіць басанож па расе, па мяккай цёплай глебе, ахапіць рукамі дрэва, прыхіліцца да яго і адчуць тую энергію і сілу, якую шчыра дае нам наша Зямля, наша Бацькаўшчына! У Зямлі – нашы карані і наша сіла.

Колькі прыгожых вершаў, песень, апавяданняў было напісана пра нашу Беларусь! Колькі было знята фільмаў… І ўсё роўна, хто тут не быў, той ніколі не зразумее, не адчуе Беларусь. Белая Русь. Белая значыць светлая, чыстая, нявінная. І сапраўды, нельга не захапляцца прыгажосцю нашай Радзімы.

Беларусь – гэта краіна першадрукара Францыска Скарыны, вялікіх асветнікаў Сымона Буднага і Сімяона Полацкага, пісьменнікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, мастакоў Марка Шагала і Хаіма Суціна і многіх іншых славутых людзей. Яны сеялі на зямлі дабро і праўду, паказвалі прыклад мужнасці і гераізму. Гэта іх талент і вялікая праца памнажалі духоўнае багацце краіны. Мы заўсёды будзем памятаць тых людзей, якія ўнеслі вялікі ўклад у фарміраванне каштоўнасцей беларусаў.

За сваю шматвяковую гісторыю Беларусь была заваявана шмат разоў, але сама ніколі не была заваёўнікам. Беларусам даводзілася мяняць веру, прымаць чужую культуру і мову, асіміляваца з іншымі народамі. Але пры ўсім гэтым краіна ніколі не губляла сваёй нацыянальнай самабытнасці. Яна схілялася, як трасцінка, каб пасля зноў выпрастацца і зазелянець.

Менавіта тут, у самым сэрцы Еўропы, час замарудзіў свой бег. Няхай вакол бурляць падзеі, змяняюцца эпохі, а ў Беларусі прырода застаецца натуральнай, людзі – чалавечнымі, каштоўнасці – вечнымі.

Уладзімір Караткевіч пісаў: “Якая яна, мая зямля? Гэта залатыя палі хлеба з сінімі вачыма васількоў…Пушчы, падобныя на храмы, дзе ганарліва нясуць свае кроны алені. Гэта бясконцыя рэкі, у якіх плёскаюцца бабры і

рыба перад заходам сонца, і гэта амаль 11 тысяч азёр, чыстых, як усмешка дзіцяці".

Пра лясы Беларусі – асобая гутарка. Лес выхаваў характар беларуса, наш чалавек і лес – родныя, і таму беларус любіць яго. Любіць сасновыя бары з імхом, што расшыты каранямі брусніц і чарніц, з ліловым верасам, у якім сядзяць карычнева-чорныя баравікі. Любіць змрочныя яловыя лясы з ляснымі азёрамі. Любіць сонечны россып папараці і зарасці ляшчыны, і лясы поўдня, дзе трапляюцца дубы, ліпы, рабіна, грабы. Лес корміць, грэе дровамі і сценамі будынкаў, дае лекі і харчаванне, лес бароніць у выпадку небяспекі, нашэсця, вайны.

На тэрыторыі краіны заснавана шмат заказнікаў і запаведных зон. У тым ліку Бярэзінскі, Белавежскі і Прыпяцкі запаведнікі. Шмат людзей працуюць, каб захаваць прыроду для нашчадкаў.

Сапраўды, няма для чалавека нічога даражэйшага за Радзіму. І любоў да яе, да роднага горада, вёскі, да роднай зямлі мы павінны пацвярджаць сваімі справамі: добра вучыцца, шчыра жыць, паважаць старэйшых, шанаваць прыроду.

І як сказаў наш Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка: "Шмат ёсць краін на свеце, але толькі пад небам Бацькаўшчыны ты зможаш знайсці сваё месца, раскрыць свае здольнасці, творчай працай прынесці найбольшую карысць грамадству і адчуць сябе па-сапраўднаму шчаслівым".

Трэба памятаць, што зямля нашых бацькоў – наша зямля. Мы ў адказе за Беларусь, за яе непаўторную прыгажосць і багатую спадчыну.

Вечна жыві і квітней, Беларусь!